**Заключение.** Проведенный сопоставительный анализ образных средств в русскоязычных и немецкоязычных фразеологизмах о деньгах позволяет сделать вывод о сложном взаимодействии универсальных когнитивных механизмов и национально-специфических особенностей мировосприятия. Образные средства фразеологизмов денежной сферы выступают не только как лингвистический инструмент, но и как ключ к пониманию ценностных ориентиров и особенностей национального характера носителей русского и немецкого языков.

1 Бинович, Л. Э. Немецко-русский фразеологический словарь. 15000 фразеологических единиц / Л. Э. Бинович – Москва: Изд-во «Аквариум», 1995. – 768 с.

2 Преподавание русского языка и литературы в школе. Практические материалы: учебно-методическое пособие / под редакцией Е. А. Поповой, В. С. Расторгуевой. – Липецк: Липецкий ГПУ, 2021. – ISBN 978-5-907461-03-1. – Текст: электронный // Лань: электронно-библиотечная система. – URL: https://e.lanbook.com/book/228680 (дата обращения: 27.02.2026).

3 Телия, В. Н. Русская фразеология. Семантический, прагматический и лингвокультурологический аспекты / В. Н. Телия – Москва: Школа «Языки русской культуры», 1996. – 288 с.

4 Рябиков, Е. Р. Терминология предметной области «деньги» в русском, английском и немецком языках / Е. Р. Рябиков. ; науч. рук. Л. М. Вардомацкий // На пороге открытий : материалы IV Международной научно-практической конференции высокомотивированных и одаренных студентов и учащихся, Витебск, 27 февраля 2025 г. : текстовое электронное издание. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2025. – С. 247–250. – Библиогр.: с. 250 (3 назв.). URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/46681.

## МОЎНА-СТЫЛЁВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЎВАСАБЛЕННЯ ВОБРАЗАЎ ПРЫРОДНЫХ ДУХАЎ У ПАЭЗІІ ЯНКІ КУПАЛЫ

***Ганчарова М.А.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт

Міфалагічныя вобразы з’яўляюцца неад’емнай часткай мастацкага свету Янкі Купалы. Класік у пачатку XX стагоддзя свядома звярнуўся да народнай міфалогіі як да сродку асэнсавання беларускага нацыянальнага быцця. Важным складнікам міфалагічнай карціны свету ў паэзіі Янкі Купалы з’яўляюцца вобразы духаў прыроды, якія ў народнай свядомасці выступаюць як гаспадары пэўных прастораў і стыхій – лесу, вады. Зварот паэта да вобразаў лесуна, вадзяніка, русалкі, хохліка і іншых персанажаў ніжэйшай міфалогіі абумоўлены імкненнем увасобіць глыбокую сувязь чалавека з прыродай, а таксама асэнсаваць яе як жывую, адухоўленую сілу, здольную ўплываць на чалавечы лёс. Актуальнасць даследавання вызначаецца неабходнасцю сістэмнага аналізу моўна-стылёвых сродкаў, праз якія рэалізуецца міфалагічная вобразнасць, што дазваляе глыбей раскрыць адметнасць стылю паэта і яго ролю ў фарміраванні нацыянальнай культурнай традыцыі. Мэта артыкула – выявіць і ахарактарызаваць моўна-стылёвыя асаблівасці рэпрэзентацыі прыродных духаў у паэзіі Янкі Купалы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі паэтычныя творы Я. Купалы. У працы выкарыстаны элементы апісальнага метада і метада кампанентнага аналізу мастацкага тэксту.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У паэзіі Янкі Купалы духі прыроды набываюць складаную сімвалічную шматпланавасць, якая рэалізуецца праз разнастайныя моўныя сродкі. Адметна, што ў адрозненне ад вобразаў нячысцікаў (чорт, злыдні), якія часцей за ўсё маюць выразна негатыўную семантыку, духі прыроды характарызуюцца амбівалентнасцю: яны могуць быць як варожымі чалавеку, так і выступаць часткай гарманічнага прыроднага свету.

Найбольш драматычна вобраз лесуна раскрыты ў паэме “У купальскую ноч”. Для стварэння вобраза паэт выкарыстоўваў трапны эпітэт: “Я дух пушчы, дух сярдзіты” [1, с. 272], які падкрэслівае варожасць істоты да чалавека. Сінтаксічная арганізацыя маўлення персанажа насычана дзеясловамі ў загадным ладзе: “кінь шукаць”, “не чапай”, “вырві

сэрца, высуш сэрца”, “не глядзі” [1, с. 272], што падкрэслівае яго ўладную пазіцыю і безапеляцыйнасць патрабаванняў. Экспрэсіўнасць узмацняецца праз таўталагічныя канструкцыі і паўторы: “Дух пушчы з пушчай разам / Успамінкі ўспамінае”, “Кветкі пільна я пільную” [1, с. 272]. Метафары ўказваюць на жорсткасць міфалагічнага свету: дарога да папараць-кветкі – гэта “людскіх костачак узгорак” [1, с. 272]. Псіхалагічны ціск персанажа на чалавека рэалізуецца праз градацыю пагрозлівых дзеянняў у будучым часе: “выць так будзеш”, “віцца будзеш, як вужака”, “чахнуць будзеш” [1, с. 272].

У вершы “Русалка” вобраз лясуна пададзены інакш – у кантэксце прыроднай гармоніі. Апісанне лесуна ў гэтым творы адпавядае традыцыйным народным уяўленням пра яго знешні выгляд: аўтар выкарыстоўваў эпітэты “весь кудлаты”, “з пушчы махнатай” [2, с. 161]. Лексемы “кудлаты” і “махнаты” перадаюць адчуванне дзікасці, прыроднай грубасці. Дзеяслоў “выпаўзае” надае вобразу зааморфныя рысы. Аднародныя дзейнікі ў радках “Вецер, лясун, русалка з вадзяніком, / Пушча, крыніца, ночка і месяц” [2, с. 161] аб’ядноўваюць усе элементы прыроды ў адзіны гарманічны шэраг.

Тэма ўзаемадзеяння чалавека з міфалагічнымі гаспадарамі прасторы працягваецца ў паэме “Яна і я”, дзе моўна-стылёвыя сродкі імітуюць жанр народнай замовы: “Вартуйце, сцеражыце ад цара / Ляснога, палявога, вадзянога” [3, с. 143]. Цікавым з марфалагічнага пункту гледжання з’яўляецца ўжыванне назоўніка “цараняты” (“Ад царанят яго” [3, с. 143]). Гэты суфіксальны дэрыват (суфікс -ян-/ят- са значэннем дзіцяці, патомства) падкрэслівае ўяўленне пра тое, што нячыстая сіла жыве сем’ямі, падобна да людзей.

Адметнае месца займае вобраз хохліка. У Я. Купалы ён звязаны з лесам і начной актыўнасцю. Супрацьпастаўленне “ноч – сонца” падкрэслівае прыналежнасць хохліка да цёмнага, начнога свету: “Хохлік грае, ведзьма скача, / Ноч смяецца, сонца плача” [3, с. 108]. Сам вобраз хохліка набывае рысы шкоднага, гарэзлівага духа, чыя музыка ўплывае на наваколле разбуральна: “Кветка чахне”, “Лісць трасецца” [3, с. 108]. У вершы “Даўгажданая” рэфрэн “хохлік бегаў ля варот” [2, с. 152] стварае кальцавую кампазіцыю і перадае адчуванне навязлівай прысутнасці міфалагічнай істоты ў лёсе лірычнага героя.

Найбольш разгорнута і псіхалагічна глыбока прадстаўлены вобразы русалак. У паэме “Сон на кургане” яны паказаны ў адпаведнасці з фальклорным канонам: “вісяць тры русалкі і калышуцца” [4, с. 5]. Рэалістычнасць і дынаміку іх дзеянням надае спецыфічны рэфрэн-гукапераймане: “Гу-та-та, гу-ля-ля / <...> Ад сучка да сучка” [4, с. 5]. Гэтыя гукавыя комплексы (асананс на [у], [а]) імітуюць рытм гайдання, палёту, ствараючы гіпнатычны эфект пры чытанні. Сінтаксіс маўлення русалак насычаны клічнымі сказамі і дзеясловамі імгненнага дзеяння: “я шась!”, “сучком трэсь”, “стук-стук!” [4, с. 18], што надае дынаміку і падкрэслівае іх гарэзлівы, але патэнцыйна небяспечны характар. Аўтар таксама стылізуе мову русалак пад калыханку: “Спі, наш міленькі саколік”, “Песняю – люлі, ой, лю-лі!” [4, с. 23–24]. Гэта стварае атмасферу падманлівага спакою, за якім хаваецца пагроза вечнага сну (“Будзеш ты дома, за домам...” [4, с. 23]).

У паэме “Магіла льва” русалкі выступаюць як аб’ект параўнання для перадачы трагізму лёсу гераіні: “А толькі бедную Натальку / Жыццё з ім цешыць не магло, / Як тую грэшную русалку – / Жывыя людзі і святло” [3, с. 177]. Ключавым лексічным сродкам тут выступае эпітэт “грэшная”, які накіроўвае да народнага ўяўлення пра русалак як пра праклятых істот, чыё існаванне пазбаўлена сапраўднай радасці і святла. У вершы “Пахаванне” русалкі надзяляюцца здольнасцю да спачування: “Шчырым плакалі плачам” [3, с. 153] – таўталагічны паўтор узмацняе эмацыянальнасць. У вершы “Брату-беларусу” русалкі становяцца алегорыяй роднай прыроды і нацыянальнага духу: “твае дзеці” [3, с. 15] (зварот да беларуса). Антытэза “днём аддыхаюць у жальбе / Каб ночкай... шукаці долі” [3, с. 15] падкрэслівае нязломнасць нацыянальнага духу.

**Заключэнне.** У паэзіі Янкі Купалы духі прыроды (лясун, вадзянік, русалка, хохлік) паўстаюць не проста як фальклорныя персанажы, а як складаныя мастацкія сімвалы, надзеленыя глыбокім псіхалагічным і філасофскім зместам. Моўна-стылёвыя сродкі – інверсія, паўторы, таўталагічныя паўторы, гукапіс, антытэзы – дазваляюць паэту перадаць

як драматычнае напружанне сутыкнення чалавека з прыроднымі стыхіямі, так і гарманічнае адзінства ўсяго жывога. Выяўленыя асаблівасці сведчаць пра наватарства Купалы ў выкарыстанні міфалагічнага матэрыялу і яго ўклад у фарміраванне нацыянальнай паэтычнай традыцыі.

1 Купала, Я. Збор твораў : у 6 т. / Я. Купала. – Мінск : Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, 1925. – Т. 1 : Жалейка. Гусляр. – 320 с.
2 Купала, Я. Збор твораў : у 6 т. / Я. Купала. – Мінск : Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, 1932. – Т. 6 : Вершы, пераклады. – 348 с.
3 Купала, Я. Збор твораў : у 6 т. / Я. Купала. – Мінск : Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, 1928. – Т. 5 : Спадчына. – 280 с.
4 Купала, Я. Збор твораў : у 6 т. / Я. Купала. – Мінск : Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, 1926. – Т. 2 : Шляхам Жыцця. – 353 с.

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ ВОБРАЗАЎ НЯЧЫСТАЙ СІЛЫ Ў ПАЭЗІІ ЯНКІ КУПАЛЫ

***Ганчарова М.А.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт

У пачатку ХХ стагоддзя зварот беларускіх пісьменнікаў да міфалагічнай спадчыны стаў адным з асноўных шляхоў мастацкага асэнсавання рэчаіснасці і захавання нацыянальнай ідэнтычнасці. Творчасць Янкі Купалы грунтуецца на арганічнай сувязі з народнай міфалогіяй, якая стала падмуркам для мастацкай інтэрпрэтацыі сацыяльнага жыцця народа. Актуальнасць тэмы абумоўлена неабходнасцю сістэмнага разгляду моўна-стылёвых сродкаў, пры дапамозе якіх паэт трансфармаваў фальклорны матэрыял у высокамастацкія сімвалы. Мэта даследавання – выявіць і ахарактарызаваць моўна-стылёвыя сродкі стварэння вобразаў нячысцікаў (чорта, змея, ліха і злыдняў) у паэзіі Янкі Купалы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі паэтычныя творы Янкі Купалы нашаніўскага перыяду. У рабоце выкарыстаны элементы апісальнага метада і метада кампанентнага аналізу мастацкага тэксту.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Спецыфіка купалаўскай сістэмы міфалагічных вобразаў заключаецца ў тым, што яна ўключае шырокае кола цёмных сіл, або цемнатвораў. Выкарыстанне гэтых вобразаў дазваляла паэту персаніфікаваць велізарныя сілы зла, што перашкаджаюць развіццю чалавека, і, паказваючы іх рэальную небяспеку, садзейнічаць абуджэнню добрых пачаткаў жыцця і грамадства.

У беларускай міфалагічнай традыцыі чорт паўстае як антрапаморфны ліхі дух з заморфнымі рысамі, спрадвечны антаганіст Бога, які імкнецца нашкодзіць чалавеку. Янка Купала, захоўваючы фальклорную аснову гэтага вобраза, надае яму выразнае сацыяльна-філасофскае гучанне праз багаты арсенал моўна-стылёвых сродкаў.

Лексічны ўзровень стварэння вобраза ў Купалы вызначаецца выкарыстаннем дзеясловаў, якія падкрэсліваюць агрэсіўную актыўнасць нячыстай сілы ў дачыненні да душы чалавека. У вершы “Любімось, мае суседзі!” паэт папярэджваў, што праз людскія сваркі “над душой чорт запануе” [1, с. 77], дзе адзначаны дзеяслоў набывае значэнне поўнага духоўнага заняволення. У творы “Далей і болей...” метафара “чорт за душу ўпляцецца” [2, с. 46] перадае непазбыўнасць зла, якое ўкараняецца ў свядомасць абыякавага чалавека. Псіхалагічнай глыбінёй вылучаецца вобраз у паэме “Адплата кахання”, дзе нячысцік выступае як падстракальнік да злачынства: “Чорт цешыцца: будзе для пекла ахвяра; / Штохвіля крываўшую помсту знаходзіць, / Штохвіля чарнейшыя думкі наводзіць” [1, с. 172]. Выкарыстанне эпітэта ў форме вышэйшай ступені параўнання (“чарнейшыя думкі”) паказвае нарастанне ўнутранай цемры персанажа. Пакуты лірычнага героя ў вершы “Мая доля” аўтар перадаў праз параўнанне: доля мучыць героя так, “як душу у пекле чорт”: “Гэтак цягам мяне мучыш, / Як душу у пекле чорт” [2, с. 5].

У творах сацыяльнага гучання згаданы вобраз набывае гратэскавыя рысы. У вершы “Разлад” чорт, як увасабленне сусветнага бязладдзя, “зубы скаліць” і “польку з ведзьмай